Затвярджаю

Намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце

_____І.В.Хатомчанкава

Заданні для правядзення першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове для вучняў 11 класа

2022/2023 навучальны год

Максімальная колькасць балаў за работу —49

1. Адзначце ў сказе нумары слоў, у якіх ёсць зацвярдзелыя зычныя гукі.

Максімальная колькасць балаў — 6

Невялікае1) яркае2) вогнішча3) палала на паляне4) ў густым хвойніку5) .

2.Вызначце рады слоў, дзе ва ўсіх словах пішацца літара ы:

Максімальная колькасць балаў — 6

1) тр…вога, т…хнічны, ж…рафа, гл…ток;

2) поч…рк, д…летант, др…вотня, мар…ва;

3) д…рыжабль, др…жаць, канц…лярыя, бр…зент;

4) мер…дыян, р…сора, прагл…нуць, ц…рымонія;

5) ж…харка, ж…тон, бл…ха, д…рэктар.

3. З прапанаваных сказаў выберыце нумары толькі тых, якія патрабуюць рэдагавання.

Максімальная колькасць балаў — 6

1) Вялікая колькасць беларускіх слоў, якія адсутнічаюць у сучаснай рускай літаратурнай мове, сустракаецца ў той ці іншай форме ў паасобных рускіх гаворках. 2) На сходзе чыгуначнікаў прысутнічала 200 чалавек.

3) Часта бывае так, што ў творы прысутнічаюць відавочныя прыкметы часу, а твор гэты ніяк не назавеш сучасным.

4) Самыя патрэбныя сведкі на судзе адсутнічалі.

4. У кожным сказе выберыце з дужак слова, якое падыходзіць па сэнсе.

Максімальная колькасць балаў — 5

1) Назаўтра я быў у (а)гумары/б)гуморы), не скрэблі кошкі грудзі мне.

2) Я пайшоў дадому (а)вераснёваю/б)верасоваю) пусткаю.

3) Міколка ўжо не крычаў. У яго хапіла (а)згадкі/б)здагадкі) узяцца за другое — выліваць з чаўна ваду.

4) Ладынін колькі разоў прасіў калгаснікаў не курыць, але просьбы яго былі (а)дармавыя/б)дарэмныя).

5) Ад гулу машын, што прайшлі наперад, з вершалін зляталі снегавыя (а)бліскавіцы/б)бліскаўкі), церушыліся з галін, і ў халодным паветры вісела рэдкая тканіна намаразі.

5. Выпішыце нумары толькі тых пар словазлучэнняў, якія не могуць быць узаемазамяняльнымі.

Максімальная колькасць балаў — 4

1) сезон грыбоў – грыбны сезон;

2) сшыткі вучняў – вучнёўскія сшыткі;

3) месца працы – працоўнае месца;

4) лісце бярозы – бярозавае лісце;

5) вокладка кнігі – кніжная вокладка;

6) мова літаратуры – літаратурная мова;

7) бутэлька малака – малочная бутэлька;

8) спартсмен класа – класны спартсмен.

6. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі ў сказах словамі і іх сінтаксічнай роляй. Адказ запішыце як спалучэнне літар і лічбаў.

Максімальная колькасць балаў — 4

А. З таго канца вуліцы, адкуль ішоў дзед Талаш, бяжыць ва ўвесь дух падлетак гадоў шаснаццаці.	1. Дзейнік
	2. Выказнік
Б. Ася кожны дзень трывожыцца за мужа-франтавіка.	3. Дапаўненне
В. Хто сваю маці паважае, той і чужую не пакрыўдзіць.	4. Прыдатак
Г. За вокнамі снежныя казкі расказвае сцішаны лес.	5. Недапасаванае азначэнне

7. Адзначце сказы, у якіх правільна напісаны і ўжыты лічэбнік (лічэбнікі)

Максімальная колькасць балаў — 6

1) Я налаўчыўся збіраць ягады абедзвюмя рукамі і назбіраў паўтара вядра.

2) У заапарку, які створаны ў тысяча дзевяцьсот дваццаць сёмым годзе, жыве амаль дзве тысячы сто жывёл.

3) Дзявяцера турыстаў прайшлі пятнаццаць кіламетраў.

4) У Рэспубліцы Беларусь дзесяць тысяч семьсот восемдзесят азёр.

5) У нетрах Беларусі залягае каля трыдцаці відаў розных карысных выкапняў.

8. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі. Адказ запішыце як спалучэнне літар і лічбаў.

Максімальная колькасць балаў — 4

А. Гара з плячэй звалілася	1. Гаварыць пра каго-небудзь многа непрыемнага.

Б. Гарою стаяць

В. Горы варочаць

Г. Горы вярнуць

2. Вельмі многа рабіць.

3. Усімі сіламі абараняць.

4. Абяцаць надта многа

5. Пра збаўленне ад клопатаў.

9. Устанавіце адпаведнасць паміж падкрэсленымі ў сказах словамі і іх часцінамоўнай прыналежнасцю. Адказ запішыце як спалучэнне літар і лічбаў.

Максімальная колькасць балаў — 4

А. Дзякуй вам, шляхі-дарогі, што з паходаў грозных, ратных нас прывялі дадому.

Б. Адвячоркам вецер, бы сляпы, начаваць кульгае пад ракіты.

В. Зорачкі, ніхто вас не злічыць на небе.

Г. Нягледзячы на гарачыню, на лавачцы ля дзвярэй сядзелі дзве старыя, цёпла апранутыя бабулі.

1. Прыслоўе

2. Прыназоўнік

3. Злучнік

4. Займеннік

5. Назоўнік

6. Дзеепрыслоўе

10. Вызначце нумары характарыстык, якія адпавядаюць творчай біяграфіі Васіля Быкава?

Максімальная колькасць балаў — 4

1)Нарадзіўся ў сям'і настаўніка ў вёсцы СаматэвічыКлімавіцкага павету (цяпер Касцюковіцкі раёнМагілёўскай вобласці).

2)З 1958 па 1967 год — галоўны рэдактар на кінастудыі "Беларусфільм".

3)Першыя апавяданні былі надрукаваны ў часопісе «Вожык» (1947, «Дапякло»), газеце «Гродзенская праўда» (1949, «У першым баі»).

4)Складаны лёс чалавека ва ўмовах фашысцкай акупацыі пісьменнік паказвае ў аповесці «У тумане» (1988).

5)Народны паэт Беларусі.

6)З дзяцінства захапляўся маляваннем.

7)Бацькі атрымалі паведамленне, што іх сын мужна загінуў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі каля Кіраваграда.

Адказы. Усяго — 49

1. 2,3 (6)

2. 2,3,4 (6)

3. 1,3 (6)

4. 1б; 2б; 3б; 4б; 5б (5)

5. 3,6,7,8 (4)

6. А5Б4В1Г3 (4)

7. 2,3 (6)

8. А5Б3В2Г1 (4

9. А1Б3В4Г2 (4)

10. 3,4,6,7 (4)